**Адказы на алімпіядныя заданні па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)”і ацэнка заданняў**

(У 3, 5 і 8 заданнях могуць быць іншыя варыянты адказаў)

**Максімальная колькасць балаў – 42**

| Адказы | Колькасць балаў |
|---|---|
| 2. Дзеяслоў. | **1 б.** |
| 3. Доказ 1: Сказ выражае закончаную думку.<br>Доказ 2: У сказе выражаецца паведамленне. | **4 б.** |
| 4. **Ваня:** Няпраўда! У тэксце ўжыта 7 прыметнікаў.<br>Пацвярджэнне: Мяккі, пушысты, балотных, шэрым, зялёных, лёгкае, чыстае. | **8 б.** (па 1 б. за выбар правільнага адказа,за кожнае слова; балы зніжаюцца за памылкі) |
| 5. Мяккі – цвёрды, лёгкае – цяжкае, чыстае – бруднае. | **3 б.** (па 1 б. за кожнае слова, балы зніжаюцца за памылкі) |
| 6. Мяккі, паўсюль, елак, лёгкае, чыстае. | **5 б.** (па 1 б. за кожнае слова) |
| 7. На балотных купінах (М.с.) ускрай дарогі (Р.с.), на шэрым хмызняку (М.с.), на зялёных шатах (М.с.) елак (Р.с.). | **5 б.** |
| 8.<br><br>ускрай<br>чыстае<br>пушысты<br>хораша | **8 б.** |
| 9.<br>А) Грозны дзядзька Гром.<br>Свой варыянт (калі падыходзіць)<br>Б) Дзеяслоў.<br>В) Прыкладны план<br>1. Пачатак навальніцы.<br>2. Стыхія бушуе.<br>3. Пасля дажджу. | **8 б.**<br>1 б.<br>1 б.<br>6 б. (балы зніжаюцца за памылкі) |

## ДАВЕДКА
### да заданняў гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 50 |

### V клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Укажыце, хто такі Ярыла паводле міфалогіі беларусаў? (Бог сонца)
2. Як адным словам па-беларуску назваць *напиток из берёзового сока?* (Бярозавік)
3. Паходжанне многіх фразеалагізмаў хаваецца ў далёкай старажытнасці і тлумачыцца светаўспрыманнем нашых продкаў. Якую жывёлу, па меркаванні нашых продкаў, трэба было з'есці, каб набыць вялікі вопыт, дасведчанасць, стаць спрактыкаваным?

(з'есці сабаку)

4. Закончыце выказванне. Арфаэпія – гэта раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца правілы вымаўлення гукаў і іх спалучэнняў.
5. Падкрэсліце арфаграмы ў слове *камп'ютар.* (камп'ютар)

**Заданне 2. Адкажыце на пытанні. Адказы пазначце ў табліцы (Пры адказе "так" пастыўце знак "+", пры адказе "не" – пастаўце "–").**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| № п/п | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|
| 1. | У беларускай мове гук [д] пры змякчэнні змяняецца на [дз'] | + |
| 2. | У беларускай мове гук [т] пры змякчэнні змяняецца на [дз'] | – |
| 3. | Дзеканнем называецца змяненне гука [д] пры яго змякчэнні на гук [т'] | – |
| 4. | Цеканнем называецца змяненне гука [т] пры яго змякчэнні на гук [ц'] | + |
| 5. | Пасля [дз'] пішуцца літары а, о, э, у | – |

**Заданне 3. Устаўце прапушчаныя літары.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

**Адказ:** Юпітэр, камюніке, рэльеф, дрывотня, страус, чэрствы, легенда, каляндар, цырымонія, глытаць.

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

***Прыкладны адказ.*** *На рымлян аказала вялікі ўплыў грэчаская культура. На аснове грэчаскага алфавіта рымляне стварылі свой, лацінскі, алфавіт. Ім карыстаюцца многія народы свету і ў цяперашні час. Рымляне перакладалі на сваю мову літаратурныя творы грэкаў. У школах дзеці вывучалі грэчаскую мову і літаратуру.*

**Заданне 5. Раскрыйце дужкі, пастаўце займеннік *я* ў патрэбную форму.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

**Адказ:** пісалі мне, падысці да мяне, абвінавачваць мяне, ганарыцца мной (-ою), успамінаць аба мне.

**Заданне 6. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

Адказ: 1. Кніга – маленькае акенца ў вялікі свет.
2. Работа і корміць, і поіць.
3. Ходзіць дзед белабароды полем, лесам, пералескам.
4. Сябры, давайце пойдзем на суботнік.
5. У акул зубы растуць безупынна, і яны заўсёды вострыя.

**Заданне 7. Ад слова** *бегчы* **пры дапамозе прыставак утварыце 5 новых слоў. Патлумачце, як прыстаўка паўплывала на значэнне ўтвораных слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за ўтворанае слова; 0,5 бала – за тлумачэнне).*

***Прыкладны адказ:*** *збегчы – 'уцячы'.*
*Прабегчы – 'бягом прайсці міма, бягом пераадолець якую-небудзь адлегласць'.*
*Перабегчы – 'бягом перамясціцца на другое месца'.*
*Адбегчы – ''бягом аддаліцца ад каго-небудзь, чаго-небудзь'.*
*Аббегчы – 'бягом зрабіць круг вакол чаго-небудзь'.*
Пабегчы – 'пачаць бегчы'.

**Заданне 8. Аднавіце "рассыпаныя" фразеалагізмы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад, А3, Б2, В1, Г5, Д4).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

**А3, Б1, В5, Г2, Д4.**

**Заданне 9. Растлумачце лексічнае значэнне слоў з легенды М.Танка "Ля вогнішч начлежных" праз падбор сінонімаў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Слова | Сінонім |
|---|---|
| *Прыклад, цівун* | *наглядчык* |
| золак | світанне |
| вогнішча | агонь, касцёр |
| магнат | пан, памешчык |
| прывід | здань |
| краля | каралева |

**Заданне 10. Літаратурны калейдаскоп.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Пытанне | Адказ |
|---|---|
| Нарадзіўся ў горадзе Полацку, вучыўся ў Італіі, у славутым Падуанскім універсітэце, вялікі вучоны, першадрукар. Пра каго ідзе гаворка? | Францыск Скарына |
| Да якога віду казак адносіцца казка "Разумная дачка" | Бытавая |
| Адгадайце загадку: Ляцяць птушкі без крыл, садзяцца – без ног | Снег |
| Якая легенда ляжыць у аснове стварэння паэмы "Ля вогнішч начлежных" М.Танка | Легенда аб узнікненні возера Нарач |
| Што абазначае назва легенды "Пестунь" | Пестунем называлі маленькае ваўчанё, якое пеставаў стары воўк; пазней паводле гэтага была названа вёска Пестунь |

# ДАВЕДКА
## да заданняў гарадскіх, раённых алімпіяд
## па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 50 |

### VI клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Паходжанне многіх фразеалагізмаў хаваецца ў далёкай старажытнасці і тлумачыцца светаўспрыманнем нашых продкаў. Што, паводле беларускай народнай мудрасці, трэба пазычыць у сабакі, каб лічыцца бессаромным? (вочы (вачэй у сабакі пазычыць)).
2. Падбярыце сінонім да слова волат – (велікан, асілак).
3. Метафара – гэта перанясенне ўласцівасцей адной з’явы на другую, чым-небудзь падобную на яе.
4. Які беларускі горад называецца так, як і летні месяц? (Чэрвень)
5. Адгадайце загадку.

Інструмент народны духавы, –
Добра яго ведаеце вы.
Ці з чароту, а ці з дрэва трубка, –
Сэрца ўзрушыць самагудка. (Адказ: дудка)

**Заданне 2. Запішыце словы ў фанетычнай транскрыпцыі.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Слова | Фанетычная транскрыпцыя |
|---|---|
| пясчаны | [п’ашчаны] |
| малацьба | [маладз’ба] |
| сцерагчы | [с’ц’эрахчы] |
| маянэз | [майанэс] |
| мільён | [м’іл’йон] |

**Заданне 3. Ад назоўнікаў утварыце прыметнікі пры дапамозе суфікса –ск-. Адказы запішыце.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| Кіргіз – кіргізскі | Нясвіж – нясвіжскі |
| Ліпень –ліпеньскі | Беларус – беларускі |
| Сакавік – сакавіцкі | Брат – брацкі |
| Слаўгарад – слаўгарадскі | Таварыш – таварыскі |
| Турыст – турысцкі | Ткач – ткацкі |

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Прыкладны адказ.** Назіраючы за прыроднымі з'явамі, чалавек імкнуўся іх зразумець. У старажытнасці людзям не хапала ведаў, каб знайсці правільнае тлумачэнне змены часоў года, дня і ночы, паходжання дажджу і грому, узнікнення і росту раслін. Усё гэта тлумачылі складзеныя чалавекам міфы.

Адгалоскі старажытных міфаў і рэлігійных уяўленняў захаваліся ў беларускіх казках, абрадах, арнаментах народнай вышыўкі.

**Заданне 5. Выпішыце назоўнікі, якія ў беларускай мове маюць мужчынскі род.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

Адказ: мастак, цень, подпіс, шынель, кенгуру, медаль, боль, жывапіс, старшыня, стэп.

**Заданне 6. Вызначце, якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова (графічна падкрэсліце).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

6. Матуля – **падтрымка** ў горы і радасці. (Выказнік)
7. Розныя дрэвы растуць у нашых **лясах.** (Акалічнасць)
8. Дамовіліся **арэхі** не есці. (Дапаўненне)
9. Разгарнуў **асцярожна** галіны. (Акалічнасць)
10. **Дзеці,** паважайце сваіх бацькоў. (зваротак членам сказа не з'яўляецца)

**Заданне 7. Укажыце спосаб словаўтварэння слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

Бяздомны –(прыставачна-суфіксальны);
падысці – (прыставачны);
чырвань – (бяссуфіксны);
каменны – (суфіксальны);
друкаваць – (суфіксальны).\

**Заданне 8. Растлумачце значэнні фразеалагізмаў. Адказы запішыце.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны*

| Фразеалагізм | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|
| Заткнуць за пояс | перасягнуць, паказаць сваю перавагу |
| Рукой падаць | блізка |
| Ні свет ні зара | рана |
| Аршын з шапкай | малы |
| Бібікі біць | гультаяваць |

**Заданне 9. Устанавіце адпаведнасць паміж назвай твора і аўтарам. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад, А3, Б2, В1, Г5, Д4).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

**Адказ: А4; Б5; Г2;Д3.**

**Заданне 10. Літаратурны калейдаскоп.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Пытанне | Адказ |
|---|---|
| Укажыце аўтара твора "Лебядзіны скіт" | У.Караткевіч |
| Укажыце, якая міфічная істота з'яўляецца поўнаўладным гаспадаром чалавечага жытла? | Дамавік (як варыянт Хатнік, Падпечнік, Гаспадар) |
| Укажыце месяц святкавання свята Каляды. | Студзень |
| Назавіце твор, галоўным героем якога з'яўляецца Сямён | "Вужыная карона" (Ян Баршчэўскі) |
| Хто ўпершыню пераклаў Біблію на родную мову і лічыў гэта найвялікшай справай свайго жыцця | Францыск Скарына |

## ДАВЕДКА
### да заданняў гарадскіх, раённых алімпіяд
### па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 50 |

### VII клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

3. Паходжанне многіх фразеалагізмаў хаваецца ў далёкай старажытнасці і тлумачыцца светаўспрыманнем нашых продкаў. Патлумачце што абазначае фразеалагізм ахілесава пята? (Найбольш слабае, паражальнае месца)
4. Якому славутаму друкару паставілі помнік у горадзе Полацку? (Ф.Скарыне)
3. На якое свята згодна легенды зацвітае папараць-кветка? (Купалле)
6. Якія рысы прыметніка ўласцівы дзеепрыметніку? (Род, лік, склон)
7. Запішыце лічэбнік ***пяць*** у форме творнага склону адзіночнага ліку. (Пяццю)

**Заданне 2. Запішыце фанетычную транскрыпцыю слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| без меры | [б’аз’ м’эры] |
| вучышся | [вучы¯с’а] |
| зжалі | [¯жал’і] |
| *з’есці* | [з’йэс’ц’і] |
| *не мог* | [н’а мох] |

**Заданне 3. Размяркуйце прыведзеныя ніжэй прыслоўі ў адпаведны слупок табліцы згодна з напісаннем.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| разам | асобна | праз дэфіс |
|---|---|---|
| бесперастанку | на памяць | абы-як |
| удвух | усё роўна | па-чацвёртае |
| штовечар | на смак | па-латыні |
| гэтаксама | | |

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Прыкладны пераклад.** *Эпоха Адраджэння стала часам стварэння шматлікіх выбітных літаратурных твораў. Яны ўвайшлі ў гісторыю і беларускай, і агульнаеўрапейскай літаратуры.*

*Выбітным узорам паэзіі на лацінскай мове з'яўляецца «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага. Меркавалася, што яна павінна ўразіць заходняга чытача расповедам пра дзікую прыроду Вялікага Княства Літоўскага. Але ў выніку «Песня пра зубра» стала гімнам усёй гэтай краіне, яе народу і слаўнай гісторыі.*

**Заданне 5.** Устанавіце адпаведнасць паміж часцінамі мовы ў першым слупку і іх характарыстыкамі ў другім. Адказ запішыце.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

**Адказ: А2; Б5; В1; Г3; Д6.**

**Заданне 6. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільна афармлены пунктуацыйна сказ).*

1. Паветра, напоенае пахамі хвоі, навісла шызаватай смугой.
2. Заняты сваёй справай, я зусім не звяртаў увагі на размову.
3. Шкодна чытаць лежачы.
4. На вільчыку, трапечучы крыльцамі, шчабятаў і пасвістваў шпак.
5. Падняўшы каўнер і прыгнуўшыся, Лабановіч спусціўся з ганка.

**Заданне 7. Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж падкрэсленымі ў сказах словамі і фразеалагізмамі. Адказ запішыце ш выглядзе спалучэння літар і лічбаў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ)*

**Адказ: А5;Б2;В1;Г3;Д4.**

**Заданне 8. Вызначце марфемную будову слоў. Устанавіце адпаведнасць паміж іх марфемнай будовай і прапанаванымі схемамі. Адказ запішыце.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ)*

**Адказ: А3;Б1;В4;Г2;Д5.**

**Заданне 9. Растлумачце лексічнае значэнне слоў з паэмы Я.Купалы "Курган", падбярыце сінонімы.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Слова | Сінонім |
|---|---|
| *Прыклад, перуны* | *маланка* |
| абшар | прастор |
| магнат | памешчык |
| дукат | манета |
| хорам | палац |
| дамоўка | труна |

**Заданне 10. Запоўніце пустыя калонкі ў табліцы.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).*

| Твор | Аўтар | Жанр |
|---|---|---|
| "Ручэй" | Якуб Колас | верш |
| "Курган" | Янка Купала | паэма |
| "Незагойная рана" | Васіль Быкаў | апавяданне |
| "Маёвая песня" | Максім Багдановіч | верш |
| "Мэры Кэт" | Мікола Лупсякоў | апавяданне |
| "На каляды к сыну" | Змітрок Бядуля | апавяданне |

**ДАВЕДКА**
**да заданняў гарадскіх, раённых алімпіяд**
**па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 50 |

**VIII клас**

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Пра які месяц казалі, што ён "…зямлю грэе, а сіверам вее" і калі ён "… халодны – год галодны"? (пра месяц май)
2. Што, паводле беларускай народнай мудрасці, трэба пазычыць у сабакі, каб лічыцца бессаромным? (вочы (вачэй у сабакі пазычыць)
3. Беларусь часта называюць краінай белых буслоў. А як вобразна назваў наш родны край Уладзімір Караткевіч? Гэтыя словы далі назву яго нарысу. (зямля пад белымі крыламі)
4. Укажыце від адносін паміж словамі: грэцкі – грэчаскі (паранімія).
5. Назыўныя сказы – гэта аднасастаўныя сказы, у якіх галоўны член мае форму дзейніка, выражанага назоўнікам у назоўным склоне.

**Заданне 2. Укажыце, якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| сшыць | ш | снег | с' |
| свята | с' | вузка | с |
| з жыта | ж | носьбіт | з' |
| без меры | з' | расчуліць | ш |
| з'еўшы | з' | самалёт | с |

**Заданне 3. У табліцы пададзены словына правапіс галосных, у кожным з якіх прапушчаны літары о, э, а. Устаўце прапушчаныя літары ў словы і запішыце іх у слупку справа насупраць адпаведных ім слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ж…мчужына | а | поч…рк | ы |
| р…монт | а | р…партаж | э |
| ж…тон | э | адр..с | а |
| канц…лярыя | ы | кр…вавы | ы |
| с..крэт | а | камп'ют..р | а |

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Прыкладны адказ.** *У першай палове XIX стагоддзя пачаўся працэс фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы.*

*Адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры стаў выпускнік Полацкай езуіцкай акадэміі Ян Баршчэўскі, які пісаў і па-беларуску, і па-польску. Ён аўтар зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Сучаснікі параўноўвалі гэты твор са знакамітым зборам твораў арабскіх казак «Тысяча і адна ноч».*

**Заданне 5. Запоўніце табліцу. Пастаўце назоўнікі ў адпаведныя формы.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| Адзіночны лік | Множны лік | Зборная форма |
|---|---|---|
| вучань | вучні | вучнёўства |

| | | |
|---|---|---|
| ліст | лісты | лісце |
| бяроза | бярозы | бярэзнік |
| звер | зверы | звяр'ё |
| пяро | пёры | пер'е |

**Заданне 6. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільна аформлены пунктуацыйна сказ).*

1. Па вузкай сцежцы, нібы марак, ішоў гусак уперавалку.
2. Спяваў усю ноч салавейка, выдумшчык самых прываблівых нот.
3. На цябе, мой сад, гляджу з любоўю.
4. За сялом у нас лугі, і нівы, і салаўіныя сады ў налівах.
5. Наш край, вядома, на песні багаты.

**Заданне 7. Выпішыце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

**Адказ:** заснежыць, бязмэтны, выкараніць, бясследны, паціху, узаконіць.

**Заданне 8. Складзіце са словам** *стомлены* **3 словазлучэнні на розныя віды сувязі (дапасаванне, кіраванне, прымыканне) і 2 сказы, каб слова выконвала сінтаксічную сувязь дзейніка і выказніка.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ)*

| | **Прыклад** |
|---|---|
| дапасаванне | стомлены чалавек |
| кіраванне | стомлены працай |
| прымыканне | стомлены празмерна |
| у сказе выконвае ролю дзейніка | Стомлены – гэта дзеепрыметнік |
| у сказе выконвае ролю выказніка | Я быў стомлены |

**Заданне 9. Падкрэсліце чацвёртае лішняе і абгрунтуйце свой выбар.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за выбранае чацвёртае лішняе і 0,5 бала – за абгрунтаванне).*

| **Літаратурны тэрмін** | **Абгрунтаванне** |
|---|---|
| Рытм, рыфма, **маналог**, страфа | адзнакі (прыметы) верша, а маналог – форма вуснага або пісьмовага маўлення |
| Кульмінацыя, **сюжэт**, завязка, развязка | назвы частак кампазіцыі, а сюжэт – сістэма падзей у апавядальным творы |
| Эпітэт, метафара, алегорыя, **інверсія** | мастацкія тропы, а інверсія – стылістычны прыём |
| Навела, аповесць, апавяданне, **легенда** | фальклорны жанр сярод літаратурных |
| **Ямб**, амфібрахій, дактыль, анапест | двухскладовая стапа сярод трохскладовых |

**Заданне 10. Запоўніце табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| **Назва твора** | **Аўтар** | **Галоўны герой** |
|---|---|---|
| "Дзяльба кабанчыка" | Віктар Карамазаў | Сцяпан |
| "Вечар" | Аляксей Дудараў | Мульцік, Ганна, Гастрыт |
| "Слуцкія ткачыхі" | Максім Багдановіч | ткачыхі |
| "Паром на бурнай рацэ" | Уладзімір Караткевіч | Пора-Леановіч, Гораў |
| "Губаты" | Генрых Далідовіч | ласяня |